Паважаныя суайчыннікі,

З мэтай выканання міжведамаснага пагаднення ў галіне адукацыі з Латвійскай Рэспублікай у частцы прыёму на вучобу ва ўстановы вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь асоб з ліку беларусаў замежжа[1], Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь устанаўліваецца наступны механізм прыёму названай катэгорыі грамадзян і крытэрыі, якім павінны адпавядаць кандыдаты на вучобу.

1. Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (далей – Міністэрства) ажыццяўляе накіраванне названай катэгорыі грамадзян на вучобу ва ўстановы вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь, за выключэннем навучальных устаноў ваеннага, спартыўнага, мастацкага і музычнага профілю, з улікам асабовых спраў на кандыдатаў, прадстаўленых Пасольствам Рэспублікі Беларусь у Латвійскай Рэспубліцы на падставе хадайніцтваў грамадскіх арганізацый суайчыннікаў.

2. Прыём беларусаў замежжа на вучобу ў Рэспубліку Беларусь ажыццяўляецца згодна з устаноўленай адпаведным пагадненнем квотай (для Латвійскай Рэспублікі – 10 чалавек, у тым ліку 2 чалавекі для атрымання вышэйшай адукацыі II ступені). На адну спецыяльнасць (для медыцынскіх устаноў вышэйшай адукацыі – профіль адукацыі[2]) залічваюцца не больш як 3 (тры) асобы.

3. Беларускія грамадскія арганізацыі Латвіі пры неабходнасці (калі колькасць заяў ад кандыдатаў перавышае прадугледжаную пагадненнем квоту) арганізоўваюць правядзенне на базе навучальных устаноў, у якіх ажыццяўляецца навучанне прадстаўнікоў беларускай дыяспары, адбор кандыдатаў для накіравання на вучобу ў Рэспубліку Беларусь шляхам правядзення іспытаў па прадметах у залежнасці ад выбранай спецыяльнасці. Пры вызначэнні іспытаў па прафілюючых прадметах для паступлення на I ступень вышэйшай адукацыі неабходна кіравацца Пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 30 чэрвеня 2015 г. "Аб уступных іспытах пры паступленні на I ступень вышэйшай адукацыі" (далей – Пастанова), якая зацвярджаецца штогод не пазней за 1 ліпеня.

Форма правядзення іспытаў для паступлення на I ступень вышэйшай адукацыі, а таксама мова правядзення ўступных іспытаў (беларуская ці руская) вызначаюцца навучальнымі ўстановамі.

4. Асабовыя справы кандыдатаў для паступлення на I ступень вышэйшай адукацыі павінны мець пералік дакументаў, прадугледжаных Правіламі прыёму асоб для атрымання вышэйшай адукацыі I ступені, зацверджанымі Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 7 лютага 2006 г. № 80, кандыдатаў для паступлення на II ступень вышэйшай адукацыі – пералік дакументаў, прадугледжаных Правіламі прыёму асоб для атрымання вышэйшай адукацыі II ступені, зацверджанымі пастановай Савета Міністраў Рэспублікі

[1] Да беларусаў замежжа адносяцца наступныя асобы:

грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія пастаянна пражываюць за межамі Рэспублікі Беларусь;
замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць за межамі Рэспублікі Беларусь і самі або іх продкі па прамой узыходзячай лініі нарадзіліся або пражывалі на тэрыторыі сучаснай Рэспублікі Беларусь;
замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць за межамі Рэспублікі Беларусь і ідэнтыфікуюць сябе як беларусы з пункту гледжання этнічнай прыналежнасці да беларускага народа або беларускай мовы, культуры, гістарычных сувязей, ведання і захавання беларускіх традыцый і звычаяў (Закон Рэспублікі Беларусь "Аб беларусах замежжа" ад 16 чэрвеня 2014 г.).

[2] Профіль адукацыі падсістэма сістэмы спецыяльнасцей і кваліфікацый, найменне якой вызначаецца родам прафесійнай дзейнасці, вылучаным на аснове агульнасці асобных відаў эканамічнай дзейнасці па дакладнай прыкмеце класіфікацыі.

Беларусь ад 2 лютага 2012 г. № 110, у тым ліку якімі пацвярджаецца прыналежнасць кандыдатаў да катэгорыі беларусаў замежжа.

4.1. Асабовыя справы павінны таксама змяшчаць копіі дакументаў аб грамадзянстве (пашпарта ці іншага дакумента для жыхароў Латвійскай Рэспублікі, якія не маюць грамадзянства). Для асоб беларускай нацыянальнасці, якія маюць грамадзянства Рэспублікі Беларусь і пастаянна пражываюць на тэрыторыі замежнай дзяржавы, у асабовай справе павінны быць таксама копіі старонак пашпарта ці іншага дакумента з адзнакай аб пастаянным жыхарстве ў замежнай дзяржаве і аб пастаноўцы на консульскі ўлік у беларускай дыпламатычнай установе.

5. Дакумент аб атрыманні агульнай сярэдняй адукацыі выпускніка альбо дыплом аб вышэйшая адукацыі павінен мець сярэдні бал не меньш як 7 балаў па дзесяцібальнай шкале, усталяванай у Рэспубліцы Беларусь.

6. Па прадметах, адпавядаючых прафілюючым іспытам, устаноўленным Пастановай, у залежнасці ад выбранай спецыяльнасці ў дакуменце аб атрыманні агульнай сярэдняй адукацыі выпускніка павінны быць адзнакі не менып як 7 балаў па дзесяцібальнай шкале, усталяванай у Рэспубліцы Беларусь.

7. Міністэрства ажыццяўляе прыём да 30 красавіка папярэдніх спісаў кандыдатаў на вучобу ў Рэспубліку Беларусь, падпісаных кіраўніком Пасольства Рэспублікі Беларусь, з указаннем канкрэтных вышэйшых навучальных устаноў і абраных спецыяльнасцей, да 25 чэрвеня – асабовых спраў кандыдатаў для паступлення на II ступень вышэйшай адукацыі і да 12 ліпеня – асабовых спраў кандыдатаў для паступлення на першую ступень вышэйшай адукацыі.

8. Міністэрства ажыццяўляе накіраванне асабовых спраў ва ўстановы вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь да 17 ліпеня для залічэння кандыдатаў у лік студэнтаў першай і другой ступені вышэйшай адукацыі.

Заўвага: усе дакументы павінны быць перакладзены на беларускую або рускую мову і завераны натарыяльна.

Просім да 24 красавіка інфармаваць аб кандыдатурах абітурыентаў, якія могуць быць рэкамендаваны да паступлення ва ўстановы вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь з улікам прыналежнасці кандыдатаў да катэгорыі беларусаў замежжа (пры наяўнасці адпаведных дакументаў).

З павагай,

Аляксандр Сушкевіч
Першы сакратар Пасольства
Беларусі ў Латвіі
Тэл.: 6722 53 91

Сачыце за нашымі навінамі ў Twitter: @BelEmbassyLV